УДК 908“1600/1900”

# ПОМНІКІ АРХІТЭКТУРЫ МАГІЛЁВА І МСЦІСЛАВА XVII – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯЎ НА ФОТАЗДЫМКАХ КРАЯЗНАЎЦЫ А. І. МЕМУСА

**Карпекін Канстанцін Рыгоравіч, кандыдат гістарычных навук,**
**галоўны захавальнік фондаў**
**Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці,**
**г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь**

Ключавыя словы: асабісты архіў, Магілёў, Мсціслаў, помнік архітэктуры, фотадакумент.

Рэферат. У артыкуле ахарактарызаваны фотаздымкі краязнаўцы А. І. Мемуса, як здадзеныя ў Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, так і з яго асабістага архіва, на якіх адлюстраваны помнікі архітэктуры г. Магілёва і г. Мсціслава XVII – пачатку XX стст.

У 2015 г. мастак і краязнаўца А. І. Мемус (нарадзіўся ў 1939 г., жыве ў г. Віцебску) здаў у Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці дакументы, узніклыя ў працэсе яго творчай дзейнасці. Да 2021 г. яны былі апісаны і ўвайшлі ў склад асобнага фонда № 474. Больш за 10 % адзінак захоўвання уяўляюць сабой фотаздымкі з адлюстраваннем забудовы гарадоў, мястэчак і вёсак Беларусі, зробленыя мастаком пад час краязнаўчых вандровак. Акрамя таго, у асабістым архіве А. І. Мемуса захоўваецца вялікая колькасць фотанегатываў – вынік тых жа падарожжаў.

Мэта дадзенага артыкула – ахарактарызаваць фотаматэрыялы з выявамі такіх старажытных беларускіх гарадоў, як Магілёў і Мсціслаў.

Што тычыцца фотаздымкаў, якія ўжо знаходзяцца на захаванні ў дзяржархіве, то яны ўтвараюць 2 справы: у адной сабраны фатаграфіі з выявамі г. Магілёва (3 дакументы) [3], у другой – з выявамі г. Мсціслава (8 дакументаў) [2]. Пад час наведвання згаданых гарадоў А. І. Мемусам была зроблена шмат большая колькасць здымкаў, пра што сведчыць наяўнасць у яго асабістым архіве 3 фотаплёнак (на 17, 28 і 26 кадраў). У сакавіку 2024 г. з дадзеных плёнак было раздрукавана адпаведна 6, 16 і 10 фатаграфій з улікам таго, што некаторыя кадры ўтрымліваюць цалкам альбо амаль цалкам ідэнтычныя выявы, а таксама, каб яны не дублявалі здымкі, раней прадастаўленыя А. І. Мемусам у дзяржархіў. У цяперашні момант раздрукаваныя фотаздымкі знаходзяцца ў неапісаным выглядзе, але ў бліжэйшай перспектыве іх плануецца ўключыць у склад фонда № 474.

Фотаздымкі, здадзеныя ў дзяржархіў, сам А. І. Мемус датаваў наступным чынам: па г. Магілёву – 1970-мі–1980-мі гг., па г. Мсціславу – 1970-мі гг. (адпаведныя надпісы зроблены асабістай рукой краязнаўцы на адваротах пераважнай большасці фотадакументаў). Больш дакладную даціроўку дазваляюць устанавіць адзнакі на фотаплёнках: «74 г.» (на дзвюх з іх) і «75 г.» (на адной). Адпаведна, даследуемыя фотаздымкі былі зроблены не раней за 1974–1975 гг.

Дзеля таго, каб ацаніць рэпрэзентатыўнасць фотадакументаў, створаных А. І. Мемусам і ступень адлюстраванасці на іх помнікаў архітэктуры, узведзеных да пачатку XX ст., варта вызначыць, колькі іх існавала ў адпаведных гарадах пад час наведвання іх краязнаўцам. Можна меркаваць, што найбольш поўны пералік падобных аб’ектаў утрымліваецца ў выданні «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць», якое пабачыла свет у 1986 г. У прыватнасці, па г. Магілёву ў згаданы пералік унесена 44 помнікі XI – пачатку XX стст., па г. Мсціславу – 19 помнікаў таго ж гістарычнага перыяду [4, с. 406].

Наведваючы г. Магілёў, А. І. Мемус зафіксаваў на фотаздымках наступныя помнікі архітэктуры, датаваныя перыядам да пачатку XX ст.:

1. Будынкі Свята-Мікольскага жаночага манастыра (мал. 1). Дадзены комплекс быў пабудаваны ў 1669–1672 гг. і складаўся з сабора ў імя свяціцеля Мікалая Цудатворца (мал. 2), царквы ў імя прападобнага Ануфрыя Вялікага (мал. 3), жылога корпуса, агароджы з брамай, званіцы [6, с. 242–244]. На фотаздымках А. І. Мемуса маюцца выявы агульнага выгляду манастыра (з рознай адлегласці), а таксама асобных будынкаў: званіцы, сабора Мікалая Цудатворца (з будаўнічымі рыштаваннямі), царква Ануфрыя Вялікага [1]. Адзначым, што А. І. Мемус наведаў манастыр у той час, калі тут як раз адбываліся рэстаўрацыйныя работы (этап знешняй рэстаўрацыі быў завершаны ў 1981 г. [4, с. 67]), што надае яго фатаграфіям эксклюзіўнасць і каштоўнасць, бо дазваляе ацаніць гэты важны працэс, які нярэдка выклікае супярэчнасці паміж спецыялістамі.

2. Станіславаўскі касцёл (мал. 4). Будаўніцтва дадзенага храма доўжылася з канца 30-х гг. да пачатку 50-х гг. XVIII ст. [4, с. 77]. На фотаздымках краязнаўцы адлюстраваны галоўны



Малюнак 1 – Званіца Свята-Мікольскага жаночага манастыра ў г. Магілёве. Не раней за 1974 г. [1].



Малюнак 2 – Сабор Мікалая Цудатворца Свята-Мікольскага жаночага манастыра ў г. Магілёве. Не раней за 1974 г. [1].



Малюнак 3 – Царква Ануфрыя Вялікага Свята-Мікольскага жаночага манастыра ў г. Магілёве. Не раней за 1974 г. [1].

фасад культавага будынка, яго агульны выгляд сярод гарадской забудовы [1], а таксама асобныя элементы (у прыватнасці – дзверы (мал. 5), упрыгожаныя дэкаратыўнай разьбой) [3, арк. 3];

3. Будынак сінагогі, размешчанай па вул. К. Лібкнехта (мал. 6). Дадзеная іўдзейская малітоўня была ўзведзена прыкладна ў канцы XIX – пачатку XX стст. [5, с. 102]. На фотаздымку А. І. Мемуса яна адлюстравана збоку, так што бачны як усе вокны асноўнага малітоўнага памяшкання, так і двухпавярховая частка будынка з жаночай галерэяй, якая дазваляе ідэнтыфікаваць гэты будынак менавіта як сінагогу.



Малюнак 4 – Станіславаўскі касцёл у г. Магілёве. Галоўны фасад. Не раней за 1974 г. [1].



Малюнак 5 – Дзверы Станіславаўскага касцёла ў г. Магілёве. Не раней за 1974 г. [3, арк. 3].

4. Будынак гарадскога тэатра, пабудаванага ў 1886–1888 гг. [4, с. 63].

На фотаздымках А. І. Мемуса адлюстраваны галоўны фасад тэатра, які ў той час з'яўляўся дзеючай установай, таму знаходзіўся ў належным стане (мал. 7).

5. Дом № 37 па вул. Ленінскай (узведзены ў XVIII ст.) [4, с. 61]. На момант фатаграфавання гэты будынак знаходзіўся ў занядбаным стане: быў не жылы, часткова адсутнічала шкло ў вокнах, наколькі бачна на выяве, адсутнічаў дах, тынкоўка і вонкавая афарбоўка былі значна пашкоджаны, тэрыторыя вакол дома таксама была неўпарадкавана. З улікам таго, што дадзены будынак на працягу 1970-х гг. рэстаўраваўся, а з 1982 г. у ім быў адчынены філіял музея [4, с. 61], фотаздымак А. І. Мемуса, па-першае, зафіксаваў выгляд збудавання да рэстаўрацыі, а па-другое, засведчыў факт таго, што прыкладна ў 1974 г. рэстаўрацыйныя работы, калі і адбываліся, то на самым пачатковым, падрыхтоўчым этапе (мал. 8).

Што тычыцца г. Мсціслава, то на фатаграфіях краязнаўцы А. І. Мемуса адлюстраваны такія архітэктурныя помнікі:

1. Кармеліцкі касцёл, будаўніцтва якога пачалося ў першай палове XVII ст. [4, с. 305]. У архіве А. І. Мемуса маюцца фотаздымкі, на якіх касцёл бачны з боку галоўнага фасада, з боку апсіды (у тым ліку з жылымі драўлянымі дамамі, якія знаходзіліся па суседству з ім). Акрамя таго, былі зроблены здымкі мураванай брамы каля касцёла (мал. 9). На фотаздымках А. І. Мемуса культавы будынак, брама і прылеглая тэрыторыя абнесены драўлянай агароджай, і значная частка самаго будынка пакрыта рыштаваннямі, што сведчыць пра ажыццяўленне там пэўных рэстаўрацыйных работ, хаця ў спецыяльнай літаратуры звестак пра рэстаўрацыю дадзенага помніка не ўтрымліваецца [4, с. 305].

2. Касцёл Святога Міхаіла Архангела, пабудаваны ў 1730–1738 гг. і ў першай палове XIX ст. перабудаваны ў праваслаўны Мікалаеўскі сабор [4, с. 306]. На даследуемых фатаграфіях ёсць выявы галоўнага фасада касцёла, яго выгляд з боку апсіды, бакавога



Малюнак 6 – Будынак сінагогі па вул. К. Лібкнехта ў г. Магілёве. Не раней за 1974 г. [1].



Малюнак 7 – Будынак гарадскога тэатра ў г. Магілёве. Не раней за 1974 г. [1].



Малюнак 8 – Дом № 37 па вул. Ленінскай у г. Магілёве. Не раней за 1974 г. [3, арк. 1].



Малюнак 9 – Кармеліцкі касцёл ў г. Мсціславе. Бакавы фасад. Не раней за 1974 г. [1]

фасада (са значнай адлегласці). Разам з касцёлам у некаторыя кадры патрапілі калішнія аптэка, семінарыя, што ўяўлялі з ім адзіны комплекс, а таксама драўляная гарадская забудова савецкага перыяду (мал. 10).

3. Аляксандра-Неўская царква, узведзеная ў 1870 г. [4, с. 309]. У асабістым фондзе А. І. Мемуса ўтрымліваецца дастаткова вялікая колькасць фотаздымкаў з выявамі гэтага праваслаўнага храма і прылеглай тэрыторыі: у прыватнасці, мураванай брамы з прыбудовамі на ўваходзе ў царкоўны двор, агульнага выгляду царквы са згаданай брамай на яе фоне, непасрэдна храма з розных бакоў, гарадской забудовы з царквой на заднім плане і інш. (мал. 11).

4. Капліца Мікалаеўскага сабора (мал. 12). На фотаздымку А. І. Мемуса адлюстраваны рэшткі дадзенай капліцы (без верхняй часткі, у мінулым жа капліца мела купал з крыжам [7, с. 256]) і мур, які акружаў двор сабора. Заўважым, што ў пералік будынкаў комплекса Мікалаеўскага сабора, змешчаны ў зборы помнікаў



Малюнак 10 – Касцёл Святога Міхаіла Архангела сярод забудовы г. Мсціслава. Не раней за 1974 г. [1]



Малюнак 11 – Аляксандра-Неўская царква ў г. Мсціславе. Не раней за 1975 г. [1]

архітэктуры па Магілёўскай вобласці, дадзеная капліца па нейкіх прычынах унесена не была [4, с. 306–307].

5. Мужчынская гімназія, пабудаваная ў 1908 г. [4, с. 303]. А. І. Мемус сфатаграфаваў гэты будынак толькі з галоўнага фасаду, і паколькі гімназія займала дастаткова вялікі корпус, яна змясцілася ў кадр толькі часткова (мал. 13).



Малюнак 12 – Рэшткі капліцы Мікалаеўскага сабора ў г. Мсціславе. Не раней за 1975 г. [1].



Малюнак 13 –Будынак мужчынскай гімназіі ў г. Мсціславе. Не раней за 1974 г. [1].

Атрымліваецца, што па г. Магілёву зафіксаваны стан 7 мураваных помнікаў архітэктуры (5 прыкладаў культавага дойлідства, 2 – грамадзянскага), па г. Мсціславу – 5 (4 культавых і 1 грамадзянскі). Іншымі словамі, даследуемыя фотадакументы дазваляюць меркаваць прыкладна пра 15 % найбольш адметных помнікаў г. Магілёва і 25 % г. Мсціслава.

Аналізуючы комплексы фотаздымкаў, прысвечаныя г. Магілёву і г. Мсціславу, прасочваецца зацікаўлены падыход А. І. Мемуса да фатаграфавання помнікаў архітэктуры. Многія будынкі сфатаграфаваны з розных ракурсаў, як цалкам, так і іх найбольш адметныя з гістарычна-мастацкага пункту погляду элементы, як паасобку, так і сярод гарадской забудовы. Пры гэтым, як правіла, кожнаму збудаванню прысвечана цэлая серыя фотаздымкаў. Адзначым, што па згаданым двум гарадам зроблены здымкі толькі вонкавага выгляду помнікаў архітэктуры (прымаючы на ўвагу неабыякавасць краязнаўцы, можна меркаваць, што патрапіць унутр агледжаных будынкаў не было аб’ектыўнай магчымасці). З улікам таго, што на фотаздымках А. І. Мемуса адлюстраваны помнікі архітэктуры ў тым стане, у якім яны знаходзіліся каля 50 гадоў таму назад, дадзеныя дакументы з’яўляюцца важнай крыніцай для вывучэння не толькі гісторыі архітэктуры ўсходнебеларускіх гарадоў XVII – пачатку XX стст., але і іх лёсу ў больш позні перыяд.

Спіс выкарыстоўваемых крыніц:

1. Асабісты архіў А. І. Мемуса.
2. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВц). – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 112.

3. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 117.

4. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць / рэд. кал. С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БСЭ, 1986. – 408 с.

5. История Могилевского еврейства: Документы и люди: Науч.-популяр. очерки и жизнеописания. В 2 кн. Кн. 1 / сост. А. Литин. – Минск : Юнипак, 2002. – 254 с.

6. Кулагін, А. М. Праваслаўныя храмы Беларусі: Энцыкл. давед. / А. М. Кулагін. – Мінск : БелЭН, 2007. – 656 с.

7. Целеш, В. М. Гарады Беларусі на старых паштоўках / В. М. Целеш. – Мінск : Беларусь, 2014. – 335 с.

УДК 94(476.5-25)«1623»

# ВИТЕБСКОЕ ВОССТАНИЕ 1623 ГОДА: ПРИЧИНЫ, МОТИВЫ, ОБСТОЯТЕЛЬСТВА

**Космач Вениамин Аркадьевич, доктор исторических наук, профессор, профессор кафедры психологии**
**Витебский государственный университет им. П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь**

Ключевые слова: Витебск, восстание, горожане, мещане, ратуша, уния, православие, католицизм, Иосафат Кунцевич, казачество, Россия, Польша, Ватикан.

Реферат. Статья посвящена известному в белорусской, и не только, истории восстанию 1623 г. в Витебске, в ходе которого был убит униатский архиепископ Иосафат Кунцевич. Акцент сделан на причинах, мотивах и обстоятельствах этого восстания. Его ход и последствия изучены более обстоятельно и хорошо известны.

Витебское восстание 1623 г. было однодневным. Оно случилось 12 ноября 1623 г. В его ходе восставшими был убит униатский архиепископ Иосафат Кунцевич. Это было народное восстание, антиуниатское и антикатолическое по своей сути. Оно явилось наиболее решительным выступлением православных против униатов и католиков с глубоко справедливыми, вполне оправданными требованиями и претензиями к униатам и тем, кто стоял за ними и поддерживал – католическому костелу и светским властям Речи Посполитой. Это был самый громкий и грозный протест православных Западной Руси (России) против Брестской церковной унии 1596 г., которая «подобно Флорентийской, не имела корней в православном народном сознании, была делом государственной политики Польши, а не церковного тяготения к Риму, и если распространялась, то только исключительно в силу насильственного ее насаждения» [1, с. 7].